WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

16 САКАВІКА 2011 г.
СЕРАДА
№ 48
(26912)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

БЕЛАРУСЬ БАЧЫЦЬ ВЯЛІКУЮ ПЕРСПЕКТЫВУ Ў АЭП

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй урада Расійскай Федэрацыі Уладзімірам Пуціным, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што «вельмі важна пагаварыць на тэму Адзінай эканамічнай прасторы і яе перспектыў, таму што як вы, так і мы ў Беларусі асабліва ўскладаем і ўскладалі вялікую надзею і бачылі вялікую перспектыву ў гэтым буйным саюзе».

«Усё, што неабходна, мы гатовы зрабіць, — адзначыў Прэзідэнт. — Мы ў Мінску заўсёды сур'ёзна ставімся да такіх мерапрыемстваў. У нас усё гатова для таго, каб пачаць працаваць, і аператыўна працаваць».

Што датычыцца двухбаковых адносін Беларусі і Расіі, то, як адзначыў Прэзідэнт, па эканамічных пытаннях праблем не ўзнікала ні ў канцы мінулага года, ні ў гэтым годзе. Ён нагадаў, што яшчэ ў сярэдзіне мінулага года была дасягнута дамоўленасць урэгуляваць усе пытанні, каб пачаць новы год без якіх-небудзь праблем. «Так быццам бы мы і зрабілі, — сказаў беларускі лідар. — Ёсць, вядома, праблемы і ў расійскай эканоміцы, і ў нашай, і мы бачым, што ў свеце адбываецца, мы не свабодныя ад гэтага, і ў асноўным гэта праблемы, якія прыўносяцца і ў расійскую, і ў беларускую эканоміку збоку». Аляксандр Лукашэнка таксама дадаў, што мае намер расказваць аб сітуацыі, што складваецца ў Беларусі, праблемах, якія з'яўляюцца, а таксама абмеркаваць шэраг іншых пытанняў.

Прэм'ер-міністр Расіі Уладзімір Пуцін адзначае паспяховае развіццё беларуска-расійскіх гандлёва-эканамічных адносін. «Мінулы год быў удачны для развіцця расійска-беларускіх эканамічных сувязяў», — сказаў прэм'ер-міністр Расіі, адзначыўшы, што гандлёвы абарот вырас на 19 працэнтаў, дасягнуўшы адзнакі $28,5 млрд.

СТАР. 2

Беларусь і Казахстан змогуць значна пашырыць свой таваразварот у АЭП

Аб гэтым кіраўнік беларускай дзяржавы заявіў учора на сустрэчы з прэм'ер-міністрам Казахстана Карымам Масімавым, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

«У нас ёсць шмат напрамкаў, якія мы разам паспяхова рэалізуем з казахстанскім бокам, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — У нас больш за 30 сумесных праектаў, якія мы ажыццяўляем у плане індустрыялізацыі ў Казахстане». «Мы гатовы яшчэ шырэй працаваць у Казахстане. Наш вопыт работы ў Рэспубліцы Казахстан сведчыць аб тым, што гэта найлепшая краіна, дзе мы можам рэалізаваць нашы дамоўленасці». Ён акцэнтаваў увагу на тым, што ў мінулым годзе беларуска-казахстанскі таваразварот наблізіўся да мяжы амаль $1 млрд. «Лічу, што ў рамках АЭП мы зможам гэту лічбу значна перасягнуць». Пры гэтым беларускі лідар заўважыў, што «Беларусь на 100 працэнтаў і ў тэрмін выканала свае абавязацельствы, і з нашай краінай праблем не будзе». У сувязі з маючымі адбыцца прэзідэнцкімі выбарамі ў Казахстане Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ў гэтай краіне цяпер складаны палітычны перыяд. Ён пажадаў Нурсултану Назарбаеву, каб гэты перыяд прайшоў спакойна. Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў упэўненасць, што Казахстан сваімі тэмпамі развіцця яшчэ здзівіць увесь свет, аб чым сведчаць вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за мінулы год і пачатак гэтага года.

У пачатку сустрэчы кіраўнік казахстанскага ўрада падкрэсліў, што перамога Аляксандра Лукашэнкі на прэзідэнцкіх выбарах — заканамерны вынік праводзімага ў краіне курсу і доказ таго, што людзі вераць канкрэтным справам і поспехам. «А рэальныя справы ў Беларусі больш чым канкрэтныя. Я неаднаразова наведваў Беларусь і скажу, што набраныя тэмпы развіцця, нягледзячы на сусветны крызіс, паказалі правільнасць той палітыкі, якую вы праводзіце разам з Нурсултанам Назарбаевым», — адзначыў Карым Масімаў.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ГОРАД ТЫСЯЧЫ КРАНАЎ

Расце сталічны мікрараён Кунцаўшчына.

«Прамая лінія»

ЖЫЦЦЁ З АЛЕРГІЯЙ

Гэта паталогія даволі частая і сустракаецца ў кожнага пятага жыхара зямлі. Алергія — гэта не толькі цяжкія захворванні, напрыклад, бранхіяльная астма, але і рыніт, крапіўніца, іншыя хваробы. Вельмі шмат алергенаў знаходзіцца ў памяшканнях, дзе мы жывём. Як вынік — бытавыя алергены ўздзейнічаюць на чалавека круглы год.

Людзям, схільным да алергічных рэакцый рознага паходжання, трэба прытрымлівацца пэўных правілаў у штодзённым жыцці. Якіх? Пра гэта мы пагаворым на нашай чарговай «прамой лініі», у якой прыме ўдзел кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт кафедры алергалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Людміла Вячаслаўна Маслава. Прамая лінія адбудзецца **23 сакавіка**, у сераду, **з 13.00 да 14.00** па нумарах: **8 (017) 292 38 92 і 292 38 21**. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах: **8 (017) 287 18 29 і 287 18 36**.

«Online-марафон»

ПЕНСІІ, БЯСПЕКА ПРАЦЫ, САЦПАДТРЫМКА

Бліжэйшым часам Міністэрства працы і сацыяльнай абароны наладзіць чарговы «online-марафон», удзел у якім могуць узяць усе жыхары нашай краіны.

Як паведаміла **прэс-сакратар міністэрства Варвара АЛЕКСАНДРОВІЧ**, у рамках «online-марафона» запланавана правядзенне трох інтэрактыўных канферэнцый. **Першая** з іх, **17 сакавіка,** будзе прысвечана пенсіям, **другая, 22 сакавіка,** — падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, стажыроўцы, павышэнню кваліфікацыі і праверцы ведаў работнікаў па ахове працы, а **трэцяя, 29 сакавіка,** — пытанням сацыяльнай абароны пажылых людзей, ветэранаў і інвалідаў. Прычым у гэтыя дні ўсе тры канферэнцыі пройдуць у аднолькавы час — **з 11.00 да 12.30.**

Дарэчы, нагадала Варвара Александровіч, задаць сваё пытанне спецыялістам міністэрства зможа кожны. Непасрэдна ў дзень і час правядзення канферэнцый зрабіць гэта магчыма праз сайт **www.mintrud.gov.by (раздзел «Інтэрактыўныя канферэнцыі»)**, а напярэдадні — праз e-mail: **press@mintrud.gov.by** або па **факсе (8-017) 306-38-84 (з адзнакай «online-марафон»)**.

Сяргей ГРЫБ.

Акіра ФУРУСАВА: З першых вуснаў

«Заўсёды былі чуткі пра будучы моцны землятрус у Японіі. Але такога ніхто не чакаў»

Пра сітуацыю ў Японіі «Звяздзе» распавёў Акіра Фурусава, старшы выкладчык кафедры ўсходніх моў факультэта міжнародных адносін БДУ.

Акіра Фурусава працуе і жыве ў Беларусі са сваёй сям'ёй. У Японіі ў яго засталіся бацькі, брат і родныя, за якіх ён вельмі перажывае. У кавярні, дзе мы сустрэліся, ён першапачаткова дастаў ноўтбук і падключыўся да скайпа.

— Спадар Фурусава, скажыце, як цяпер адчуваюць сябе вашы родныя?

— Пра тое, што ў Японіі землятрус, я даведаўся ад сваёй студэнткі пятага курса. Яна даслала мне СМС пра землятрус. Я не здзівіўся, бо для нас гэта звычайная справа. Але яна паведаміла, што ў гэты раз усё вельмі сур'ёзна.

СТАР. 2

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Акіра ФУРУСАВА: «Мае сваякі і лепшы сябар заставаліся ў Сендаі».

РЫЗЫКОЎНЫ ДАХОД

Калі абяцаюць высокія працэнты, гэта не гарантуе, што іх вам абавязкова выплацяць

СТРАЦІЦЬ пачуццё рэальнасці вельмі лёгка, калі спадзяешся ў момант пабагацець, а тут, нібыта на заказ, з'яўляецца выгадная прапанова: укласці грошы пад неймавернымі працэнты. Усе добра памятаюць вакханалію з рознымі праектамі абагачэння ў 90-х гадах мінулага стагоддзя, калі абяцанні аб казачна высокіх працэнтах нават асцярожных грамадзян уцягвалі ў «фінансавыя піраміды». Працверажэнне ж да даверлівых людзей прыходзіла толькі тады, калі «збудаванні» развальваліся, а пацярпелыя ад дзейнасці махляроў падлічвалі панесеныя страты.

З'яўленне на свет новых аналагічных праектаў ніхто не выключае і зараз. Прынамсі, у Міністэрстве эканомікі нашай краіны звяртаюць увагу на такую магчымасць. Трэба згадаць, што «фінансавая піраміда» — спецыфічны спосаб забеспячэння даходу за кошт пастаяннага прыцягнення грошай ад яе новых удзельнікаў. Звычайна, падкрэсліваюць у міністэрстве, «фінансавыя піраміды» рэгіструюцца як камерцыйныя арганізацыі, якія прыцягваюць сродкі для фінансавання нейкага праекта. Калі рэальная даходнасць праекта аказваецца ніжэй за абяцаныя інвестарам даходы ці наогул адсутнічае, значыць, частка сродкаў новых інвестараў накіроўваецца на выплату даходу. Заканамерным вынікам такой сітуацыі з'яўляецца банкруцтва праекта і страты апошніх інвестараў. Як паказвае практыка, пасля краху «фінансавай піраміды» ўдаецца вярнуць толькі нязначную частку (каля 10-15 працэнтаў) ад сабранай на той момант сумы. Прычым, чым даўжэй функцыянуе «фінансавая піраміда», тым меншы працэнт магчымага вяртання пры яе ліквідацыі. Прынцыповым адрозненнем «фінансавай піраміды» ад рэальнага бізнэс-праекта з'яўляецца крыніца выплаты даходу: калі сума выплат даходу стабільна перавышае памер дабавачнай вартасці, якую забяспечвае гэты бізнэс, то такі праект з'яўляецца «пірамідай».

У Мінэканомікі таксама адзначаюць, што з развіццём сродкаў тэлекамунікацыі павялічваецца колькасць «пірамід», у якіх фінансавыя аперацыі і прыцягванне сродкаў ажыццяўляецца праз інтэрнэт. Апошнія адрозніваюцца тым, што ў атрымальніка сродкаў ёсць магчымасць заставацца ананімным. А гэта значна ўскладняе адсочванне грашовых патокаў і прыцягненне да юрыдычнай адказнасці. Як вынік, вяртанне грошай становіцца амаль немагчымым.

Таму ў міністэрстве звяртаюць увагу людзей, якія вырашылі прыняць удзел у якім-небудзь праекце, заснаваным на прыцягненні ўкладаў насельніцтва, на тое, што трэба праявіць асаблівую асцярожнасць і пільнасць у асобных выпадках. У прыватнасці, неабходна вельмі добра падумаць, перш чым укладваць свае грошы, калі рэклама абяцае высокія працэнтныя выплаты, узровень якіх заведама вышэйшы за сярэдні па рынку пазыкі, а рызыкі пры гэтым, маўляў, адсутнічаюць.

Насцярожыць павінна і засяроджанасць кіраўнікоў кампаніі выключна на PR-акцыях. Адукаваныя прадаўцы, пафасныя прэзентацыі, сайты, рэкламныя рассылкі — усё расказвае, як вам пашанцавала і колькі вы можаце зарабіць. Пры гэтым не прадастаўляецца ніякай канкрэтнай інфармацыі, якую можна праверыць на падставе звестак з незалежных крыніц. Між іншым, часта гэты мінус падносіцца як частка нейкай стратэгіі па нераспаўсюджванні значнай інфармацыі. Таксама не на карысць справе выкарыстанне спецыфічных тэрмінаў накшталт «ф'ючарс», «трэйдынг» і т.п, якія могуць быць незразумелымі непрафесіяналам, ананімнасць арганізатараў і каардынатараў праекта, адсутнасць у кампаніі, якая арганізуе праект, офіса і мноства арганізацый, зарэгістраваных па адным і тым жа адрасе. Нарэшце, трэба быць пільнымі ў тым выпадку, калі для ўдзелу ў праекце неабходны невялікі стартавы капітал (напрыклад, 300-500 долараў), што дазваляе ахапіць шмат людзей, якія лёгка прымірацца са стратай такіх сродкаў без звяртання ў судовыя органы; калі ўкладзеныя грошы перамяшчаюцца па вялікай колькасці краін (у адной краіне атрымалі, у другой — застрахавалі, у трэцяй — купілі акцыі): як вынік, страчваецца магчымасць за імі назіраць і атрымаць назад.

Ігар ГРЫШЫН.

РЭЗКАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ РУБЛЯ НЕ БУДЗЕ

Нацыянальны банк заяўляе пра тое, што сёлета курс нацыянальнай валюты не выйдзе за межы плюс/мінус 8 працэнтаў да кошыка замежных валют

НЕКАЛЬКІ апошніх дзён не спадае ажыятажны попыт на наяўную замежную валюту, справакаваны чуткамі пра магчымую істотную дэвальвацыю беларускага рубля. Нягледзячы на тое, што тэрмін «прадказанага» падзення рубля да долара (несуцяшальныя «прагнозы» «гарантавалі», што 1 долар будзе каштаваць каля 4000 рублёў) выйшаў, а курс нацыянальнай валюты так і не абрынуўся, беларусы па інерцыі працягваюць атакаваць пункты абмену.

Магчыма, паўплывала тут на сітуацыю і выказаная МВФ рэкамендацыя наконт таго, што беларускі рубель трэба дэвальваваць больш як на 8 працэнтаў, якая, дарэчы, не была падтрымана нашымі ўладамі. Вынікам жа таго, што людзі заблыталіся ў шэрагу чутак вакол лёсу рубля, стала тое, што «абменнікі» апынуліся не ў стане задаволіць «апетыт» насельніцтва на СКВ, які раптоўна ўзрос. Апошняя сітуацыя тлумачыцца тым, што зараз банкі могуць купіць на біржы замежную валюту для падмацавання абменных пунктаў толькі на суму фактычнай розніцы паміж прададзенай насельніцтву і купленай у яго валюты на працягу мінулага месяца. Між тым, у студзені-лютым пасля ажыятажнай хвалі лістапада-снежня мінулага года попыт на наяўную валюту рэзка знізіўся: напрыклад, у лютым розніца паміж купленай і прададзенай насельніцтву валютай складала крыху менш за 18 мільёнаў долараў. Разам з тым, толькі за адзін дзень — 11 сакавіка — попыт людзей на наяўную дзёрданканверсоўную літаральна зашкальваў: у «абменніках» купілі ў эквіваленце на... 25 мільёнаў долараў больш, чым прадалі. Адсюль і праблемы з напаўненнем абменных пунктаў наяўнай СКВ.

Як распавёў карэспандэнту нашай газеты **намеснік начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Міхаіл ЖУРАВОВІЧ**, скаргі людзей на тое, што ў абменных пунктах не хапае валюты, паступаюць у галоўны банк краіны не толькі са сталіцы, але і з некаторых іншых рэгіёнаў рэспублікі. Паводле яго слоў, банкам ва ўмовах масавай скупкі складана насыціць «абменнікі» цвёрдаканверсоўнай, паколькі, па-першае, купля валюты банкамі на біржы для падмацавання абменных пунктаў, як згадвалася вышэй, абмежаваная розніцай паміж купляй і продажам, а па-другое, ёсць на гэта і тэхнічныя прычыны: валюту банкам неабходна не толькі закупіць, але і даставіць да месца, на што патрэбны час. Са свайго боку, запэўніваюць у галоўным банку, Нацыянальны банк будзе прымаць захады, каб задаволіць попыт на замежную валюту, — ён валодае ўсімі неабходнымі для гэтага манетарнымі інструментамі.

Разам з тым, у Нацбанку мяркуюць, што ў хуткім часе ўсё ж такі «гонка» за замежнай валютай прыпыніцца, бо здаровы сэнс у людзей возьме верх над эмоцыямі. Ужо відавочна, што аб'ектыўна абясцэньвання рубля не адбываецца: на сёння ў параўнанні з 31 снежня 2010 года зніжэнне курса беларускага рубля да кошыка валют склала 4,50 працэнта (у параўнанні з 15 сакавіка курс нацыянальнай валюты адносна кошыка ўмацаваўся на 0,08 працэнта).

У сувязі з апошнімі падзеямі Нацыянальны банк Беларусі таксама выступіў з афіцыйнай заявай, у якой назваў чуткі пра магчымую рэзкую дэвальвацыю нацыянальнай валюты правакацыйнымі і падкрэсліў, што змяненні абменнага курса беларускага рубля, якія выходзяць за межы параметраў, устаноўленых Асноўнымі напрамкамі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі на 2011 год, не плануюцца і рабіцца не будуць.

«Нацыянальны банк, — гаворыцца ў заяве, — будзе ажыццяўляць палітыку курсаўтварэння строга ў межах калідора дапушчальных змяненняў курса беларускага рубля да кошыка замежных валют — плюс/мінус 8 працэнтаў у адносінах да значэння курса, які склаўся на пачатак 2011 года (1057,04 рубля), забяспечваючы пры гэтым плаўнасць і прадказальнасць дынамікі курса».

У заяве адзначаецца, што пры гэтым двухбаковыя курсы беларускага рубля ў адносінах да замежных валют, якія ўваходзяць у склад кошыка, будуць таксама змяняцца неістотна пад уплывам узаемных змяненняў курсаў гэтых валют на сусветных рынках. Акрамя таго, у галоўным банку краіны зазначаюць, што «для забеспячэння ўстойлівасці нацыянальнай валюты Нацыянальны банк валодае як усімі неабходнымі манетарнымі інструментамі, так і золатавалютнымі рэзервамі». «Іх узровень, — канстатуецца ў паведамленні Нацбанка, — цалкам дастатковы для падтрымання стабільнасці беларускага рубля і дазваляе ў поўным аб'ёме задавальняць попыт на замежную валюту з боку насельніцтва, аператыўна рэагаваць на кан'юнктурныя змяненні попыту на ўнутраным валютным рынку, гарантаваць плацяжы па знешніх абавязацельствах».

На сёння афіцыйны курс беларускага рубля ўстаноўлены 3 022 рублі за долар: у параўнанні з 15 сакавіка курс нацыянальнай валюты да долара ўмацаваўся на 0,07 працэнта.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 16.03.2011 г. (для б/н разлікаў)				Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼	1 долар ЗША	3 022,00	1 чэшская крона 172,36	USD	28,7263
▲	1 еўра	4 211,46	1 польскі злоты 1 033,34	10 UAH	36,1565
	1 латвійскі лат	5 944,72	▼ 1 расійскі рубель 105,20	1000 BYR	9,4963
	1 літоўскі літ	1 216,22	1 украінская грыўня 380,08	EUR	39,9813

Мікалай ГРУША:

«Узровень бяспекі на нашай будучай АЭС будзе на некалькі парадкаў вышэйшы, чым на «Фукусіме-1»

Нагадаем, што пасля землятрусу на японскіх АЭС «Фукусіма-1» і «Фукусіма-2» з-за выхаду са строю сістэм ахаладжэння быў уведзены рэжым НЗ. 12 сакавіка на «Фукусіме-1» адбыўся выбух, аб'яўлена эвакуацыя ў радыусе 20 км. У панядзелак адбыўся выбух на трэцім энергаблоку гэтай жа станцыі, а ў аўторак — на другім рэактары. Пазней урад Японіі паведаміў аб пажары на чацвёртым блоку АЭС.

— Японская атамная станцыя, пра якую цяпер усе пішуць, была запушчана ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя, — патлумачыў нашай газеце **дырэктар Дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мікалай ГРУША**, — і ніякіх адносінаў да праектаў трэцяга пакалення (па якім будзе будавацца наша АЭС. — **Аўт.**) яна, безумоўна, не мае. Адназначна: узровень бяспекі на нашай будучай АЭС на некалькі парадкаў будзе вышэйшы, чым там. Гэта прызнаюць ва ўсім свеце.

Мікалай Міхайлавіч патлумачыў, што японская атамная электрастанцыя будавалася даўно, па старым праекце. Апроч таго, там прымяняецца іншы (чым у нас) тып рэактара — кіпячы ядзерны рэактар, які, на думку навукоўца, не такі бяспечны, як будзе ў нас.

Увогуле, «Фукусіма-1» — першая атамная электрастанцыя, якую пабудавала і эксплуатуе Такійская энергетычная кампанія. «Фукусіма-1» мае 6 энергаблокаў (агульнай магутнасцю 4,7 ГВт), першы з якіх пачаў будавацца яшчэ ў 1967 годзе і быў уведзены ў эксплуатацыю 26 сакавіка 1971 года. Шосты — 24 кастрычніка 1979 года.

Інга МІНДАЛЁВА.

Рэха аварый на АЭС у Японіі беларусам не пагражае

У сувязі з аварыяй на японскай атамнай станцыі «Фукусіма-1» у Беларусі ўзмоцнены кантроль за радыяцыйнай абстаноўкай. Радыяцыйна-гігіенічны маніторынг ажыццяўляецца на 34 кантрольных участках, раўнамерна размеркаваных па ўсіх абласцях. Паводле звестак маніторынгу, радыяцыйная абстаноўка на тэрыторыі нашай краіны застаецца нязменнай, радыяцыйны фон не перавышае ўстаноўленых значэнняў.

Так, 13 сакавіка магутнасць дозы гама-выпраменьвання ў Мінску і ўсходніх раёнах Віцебскай вобласці складала 0,10-0,12 мкЗв/гадзіну, ва ўсходніх раёнах Магілёўскай вобласці — 0,04-0,12 мкЗв/гадзіну, што адпавядае натуральнаму гама-фону, характэрнаму для гэтай мясцовасці.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ОАО «Белагропромбанк»

С 16 марта 2011 года на основании постановления Правления Национального банка Республики Беларусь от 10.03.2011 № 78 размер ставки рефинансирования установлен в размере 12 процентов годовых.

В соответствии с условиями договоров ОАО «Белагропромбанк» сообщает об увеличении процентных ставок по договорам банковских вкладов «Универсальный», заключенным в период с 02.08.2004 по 05.03.2006, и «Сберегательный», заключенным в период с 25.10.2004 по 05.03.2006, на 1,5 процентного пункта с 16.03.2011.

Телефон Контакт-Центра Банка – 136
8.00–20.00 – рабочие дни, 8.00–18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

З АВАРЫЙНАЙ АЭС АДБЫЎСЯ ВЫКІД РАДЫЯЦЫІ Ў АТМАСФЕРУ

Агульныя страты японскай эканомікі ад цярпашніх прыродных і тэхнагенных катастроф дасягнуць каля $1 трлн. З такім прагнозам выступілі аналітыкі банкаў Лондан-Сіці, паведамляюць інфармагенцтвы.

Разлікі зроблены з улікам уздзеяння цяперашніх узрушэнняў на эканамічную сітуацыю ў бліжэйшыя гады, а сума ўрону мае доўгатэрміновы характар.

Тым часам на чацвёрты дзень пасля самага разбуральнага за ўсю гісторыю Японіі землятрусу магнітудай 9 балаў сітуацыя ў краіне застаецца вельмі цяжкай. Так, учора раніцай на 4-м рэактары аварыйнай японскай АЭС «Фукусіма-1» адбыўся выбух вадароднага газу. Паводле паведамленняў СМІ, пашкоджана абалонка рэактара, адкуль адбыўся выкід радыяцыі.

Адмыслоўцы выказалі здагадку, што выбух мог пашкодзіць сістэму зніжэння ціску рэактара. У сувязі з гэтым персанал энергаблока атрымаў загад аб эвакуацыі. Экстранай эвакуацыі падлягалі таксама жыхары ў 20-кіламетровай зоне. У зоне радыусам 30 км, дзе пражываюць 140 тыс. чалавек, людзей папрасілі па магчымасці не выходзіць з дамоў.

Пасля выкіду радыяцыі на АЭС «Фукусіма-1» у шэрагу прэфектур Японіі адзначаецца павышэнне радыеактыўнага фону.

Акрамя гэтага, учора гарэла сховішча адпрацаванага паліва станцыі. Узгаранне суправаджалася выкідам у атмасферу радыеактыўнага матэрыялу. Паводле інфармацыі МАГАТЭ, радыяцыйны фон у раёне сховішча дасягаў 400 мілізівертаў у гадзіну, што амаль у 1000 разоў перавышае дапушчальныя значэнні. Reuters піша са спасылкай на Сусветную ядзерную асацыяцыю, што нават узровень радыяцыі вышэй 100 мілізівертаў у год можа выклікаць рак. Для параўнання эксперты сцвярджаюць, што чалавек атрымлівае апрамяненне ў 12 мілізівертаў падчас стандартнай працэдуры камп'ютарнай тамаграфіі сэрца.

Такім чынам, зараз на ўсіх шасці рэактарах АЭС склалася аварыйная сітуацыя.

Паводле апошніх звестак, у выніку стыхійнага бедства загінулі больш трох тысяч чалавек. Каля дзвюх тысяч атрымалі раненні. Больш за 17 тысяч чалавек лічацца прапаўшымі без вестак.

У РАЗБУРАНАЙ ЗЕМЛЯТРУСАМ ЯПОНІІ ПРАЧНУЎСЯ ВУЛКАН СІНМОЭ

На паўднёвым захадзе разбуранай землятрусам Японіі прачнуўся вулкан Сінмоэ. У паветра на вышыню да чатырох кіламетраў ляцяць попел і камяні. Адмыслоўцы прысвоілі вулканічнай актыўнасці тры з пяці балаў па шкале небяспекі.

Улады прэфектуры Міядзакі, дзе размешчаны вулкан, заклікаюць жыхароў трымацца як мага далей ад Сінмоэ. З небяспечнай зоны эвакуіруюць людзей.

КАДАФІ ПРЫСТРАШЫЎ ЗАХАД САЮЗАМ З «АЛЬ-КАЕДАЙ»

Палкоўнік Муамар Кадафі ў інтэрв'ю італьянскай газеце «il Giornale» прыстрашыў Захад, што калі замежныя войскі ўвойдуць у Лівію, то ён далучыцца да джыхаду Асамы бен Ладэна.

«У гэтым выпадку мы самі станем саюзнікамі «Аль-Каеды» і абвесцім святую вайну», — сказаў палкоўнік, адказваючы на пытанне, ці не баіцца ён скончыць свае дні, як Садам Хусейн.

Пры гэтым ён поўнасцю адмёў магчымасць вядзення перамоў з паўстанцамі, заявіўшы, што яны ўсе — тэрарысты і памагатыя Асамы бен Ладэна, з якімі ніякіх гутарак весткі нельга. Кадафі таксама прызнаўся, што моцна расчараваны стаўленнем з боку яго «еўрапейскіх сяброў», асабліва — італьянскага прэм'ер-міністра. «Я сапраўды шакіраваны. Я адчуваю, што мне здрадзілі. Я не ведаю, што сказаць Берлусконі», — паскардзіўся палкоўнік.

Апраўдваючы неабходнасць выкарыстання супраць паўстанцаў цяжкіх узбраенняў, дзяржаўнае тэлебачанне Лівіі адзначае, што супернікі рэжыму — гэта баевікі «Аль-Каеды», якія «ў мячэцях раздаюць моладзі галюцынагенныя таблеткі».

ГЕРМАНІЯ ПРЫПЫНІЛА ПРАЦУ СЯМІ СТАРЫХ АЭС

Урад Ангелы Меркель на тры месяцы прыпыніў працу сямі самых старых атамных электрастанцый Германіі, якія былі ўведзены ў эксплуатацыю яшчэ ў 70-х гадах мінулага стагоддзя, паведамляе Welt.

Гаворка ідзе пра АЭС «Брунсбютэль», «Некарвестхайм», «Ізар 1», «Філіпсбург 1», «Бібліс А», «Бібліс Б» і «Унтэрвезер». Рашэнне пра далейшы лёс гэтых станцый будзе прынята пасля старанной праверкі іх сістэм бяспекі. Напярэдадні ўрад ФРГ увёў трохмесячны мараторый на выкананне прынятага ў 2010 годзе закона пра падаўжэнне тэрмінаў дзеяння 17 нямецкіх АЭС. Закон прадугледжвае, што тэрміны эксплуатацыі станцый, пабудаваных да 1980 года, павялічацца на 8 гадоў, а АЭС, пабудаваных пасля 1980 года, — на 14 гадоў.

ISSN 1990 - 763X